Бязлітасная, дзікая барацьба за ўладу кіруе вамі. Вам няма ніякай справы да нашых патрэб, да нашых бед і трывог. Толькі каб кіраваць, толькі б месца адваяваць цяплейшае. І калі вы абліваеце адзін аднаго граззю, гэта так добра бачна. А нам не патрэбна ваша злосць, нянавісць. На чале палітыкі павінны быць людзі добрыя, шчырыя, паважлівыя і з галавой таксама.

Зразумела, вам там, уладу маючым, лягчэй і сытней жывецца. Вам невядома такое пачуццё безвыходнасці, калі няма чым накарміць сям'ю, не хапае грошай да зарплаты, калі няма за што купіць неабходнае адзенне, закіпяціць чайнік з-за адсутнасці газу. Я ўжо не кажу пра мэблю і тэлевізар — іх купіць таксама няма магчымасці.

В.ПАЎЛАВА.

г.Шклоў.

Майстры



Хто сказаў, што ў нас праектуюць толькі "каробкі"?

Сяргей ГРЫЦ
Фота аўтара

Бачыце, як гарманічна ўпісваецца ў наваколле жылы дом, праект якога трымае архітэктар інстытута "Мінскпраект" Алег Аляксандравіч Ладкін? Усё тлумачыцца проста: два такія дамы, спраектаваныя менавіта Алегам Аляксандравічам, будуць пабудаваны тут, у цэнтры мінскага мікрараёна Уручча.

— Я не сумняваюся, што тым, хто будзе ехаць у Мінск па Маскоўскай шашы, спадабаецца панарама сучасных арыгінальных забудоў. Дарэчы, менавіта Алегу Аляксандравічу Мінск ужо абавязаны некаторымі адметнымі рысамі архітэктурнага аблічча. Жылы дом на набярэжнай Свіслачы паблізу Траецкага прадмесця, бібліятэка ў цэнтры мікрараёна Чыжоўка, будынак НДІ ЭВМ — гэта ўсё ўвасобленыя ў жыццё праекты Алега Аляксандравіча.

Рэпарцёр даведаўся

Няўжо ў нас малююць толькі шэрым?

Ніхто з беларускіх дзяцей пакуль што не захацеў прыняць удзел у міжнародным Шэнкарскім спаборніцтве ў галіне дзіцячага малюнка ці літаратурнага сачынення.

Умовы ўдзелу ў гэтым спаборніцтве пасольства Індыі ў Рэспубліцы Беларусь распаўсюдзіла яшчэ ў пачатку лета: да 1 студзеня 1994 года каляровыя малюнкі ці сачыненні на англійскай мове трэба даслаць у гэту краіну. Пераможцам спаборніцтва прадугледжаны шматлікія прэміі, залатыя і сярэбраныя медалі.

Умовы конкурсу дакладна ведаюць усе абласныя аддзелы культуры.

Ірына ФЁДАРАВА.

Брастаўчане пакарылі Еўропу. Гарэлкай

Міжнароднай залатой зоркі за выдатную якасць прадукцыі ўдастоены Брэсцкі лікёра-гарэлачны завод.

Такое паведамленне прыйшло на прадпрыемства з Іспаніі, дзе вядучыя заходнія эксперты высока ацанілі моцныя напіткі брастаўчан. Пастаўляючы сваю прадукцыю ў 15 краін далёкага замежжа, завод у апошнія гады не атрымаў ні адной рэкламацыі.

Іван КУКСА,
Белінфарм.

Клуб абяцае задаволіць. Нафтай

Магчыма, ужо ў бліжэйшы час будзе зарэгістравана Народная акцыянерная нафтавая кампанія (НАНК).

Цяпер у Беларусі дзейнічае закрытае прамысловае акцыянернае таварыства "Нафтавы клуб". Сярод яго 16 заснавальнікаў — Мазырскі і Наваполацкі нафтаперапрацоўчыя заводы, Саюз прадпрымальнікаў і іншыя. Па атрыманай у Саюзе прадпрымальнікаў інфармацыі, статутны фонд нафтавага клуба складае 500 мільёнаў рублёў. Беларускія прадпрымальнікі разлічваюць задаволіць патрэбнасць рэспублікі ў нафце.

Ларыса КЛЮЧНІКАВА,
Белінфарм.

Факт

"Ваше слово, товарищ маузер?"

Как стало известно корреспонденту РИДа, жители Минска имеют ныне около 18 тысяч единиц газового и огнестрельного оружия.

Лишь семь тысяч "стволов" числится за охраной предприятий, организаций и учреждений.

В связи с недавно утвержденной МВД инструкцией, которая регламентирует хранение, ношение и использование в целях защиты газового оружия, ожидается, что обладателей пистолетов и револьверов станет гораздо больше.

Юрий ЛЕШКЕВИЧ.

Службовыя драмы

Нехта вінаваты, але хто?

Мікалай ГАЛКО

Тое, што адбылося на савеце Кантрольнай палаты пры разглядзе спраў на прадпрыемствах Дзяржкам../прама, можна без вялікіх нацяжак назваць і трагедыяй, і камедыяй. Атрымалася захапляльнае відовішча для аматараў эканамічных перыпетый, дзякуючы ўдзелу ў пасяджэнні намесніка старшыні Дзяржкампрама Міхаіла Ванкевіча.

Пасля таго як загадчык аддзела кантролю за інвестыцыйнай дзейнасцю, народны дэпутат Рэспублікі Беларусь Мікалай Крыжаноўскі грунтоўна выклаў сведчанні аб шматлікіх парушэннях, Міхаіл Яўгенавіч выйшаў на трыбуну з намерам даць кантралёрам знішчальны бой.

Камічнае пачалося адразу. У адказ на бяскрыўдную рэпліку, дзе ў бяскрыўдным кантэксце прагучала і слова "кожны", Ванкевіч ваяўніча абвясціў, што ён далёка не "кожны", а намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта. Калі ж прысутныя лічаць яго "кожным", то ён пакідае трыбуну і залу. Пасля такога дэмаршу намеснік старшыні палаты Вячаслаў Радомскі стаў звяртацца да Ванкевіча не інакш, як "паважаны высокапастаўлены намеснік старшыні". Трэба адзначыць, што на ўзнёслы зварот Ванкевіч не крыўдаваў.

Што гэта — гульня дарослых людзей у філалогію з псіхалогіяй? Амбіцыйныя практыкаванні? Не без граху, канешне, але корань справы закапаны глыбей.

Кантрольная палата сабрала і прааналізавала шматлікія звесткі аб парушэннях Дзяржкампрамам законаў аб дзяржаўным бюджэце за мінулы і бягучы гады.

Так, асабіста намеснік старшыні М.Бохан дазволіў аб'яднанню "Планар" выкарыстаць не па мэтаваму прызначэнню звыш 9 мільёнаў рублёў.

Намеснік старшыні М.Ванкевіч неабгрунтавана праіндэксаваў Мінскаму вытворчаму аб'яднанню вылічальнай тэхнікі раней выкананыя дагаворы, у выніку чаго дзяржава панесла страты звыш 11 мільёнаў рублёў.

Яшчэ 122 мільёны выкарыстаны не па прызначэнню з ільготных крэдытаў на канверсійныя мерапрыемствы.

За кошт крэдыту ФРГ мінскаму аб'яднанню "Гарызонт" распараджэннем Савета Міністраў выдзелена 20 мільёнаў нямецкіх марак. Сума вялікая і выкарыстаць яе збіраліся з розумам. Збіраліся, але выйшла не зусім тое, што планавалі. Праядаць вялікія грошы можа толькі непрадбачлівы чалавек. Нямецкія маркі менавіта, вобразна кажучы, праелі. На іх закупілі не абсталяванне, як збіраліся, а кінескопы. Урад вырашыў адно, а "Гарызонт" зрабіў другое. Кіраўнікі аб'яднання самастойна ўнеслі дапаўненне ў кантракт і не палічылі патрэбным узгадняць яго ні з урадам, ні з іншымі кампетэнтнымі структурамі.

Дзяржкампрам у дадзеным выпадку не прарэагаваў як орган дзяржаўнага кіравання.

Факт самавольства кіраўнікоў "Гарызонта" М.Ванкевіч спрабаваў выкарыстаць як казырную карту ў сваёй абароне.

— А што рабіць, — прыкладна так казаў Міхаіл Яўгенавіч, — у нас ёсць генералы накшталт Санчукоўскага, якія ў любы момант адчыняюць саўмінаўскія дзверы, не звяртаючы на нас увагі.

Вось тут я і падумаў, што сёння справаздачу павінен рабіць не намеснік старшыні Ванкевіч, а сам старшыня Дзяржкампрама У.Куранкоў. Хаця намеснік — далёка не хлапчук для дробязных даручэнняў, але ж не адзін намеснік накіроўвае мільёны налева і направа, павінна быць у Дзяржкампрама стратэгічная лінія, тактычныя накірункі.

Што мог сказаць пра аб'яднанне "Гарызонт" М.Ванкевіч, акрамя з'едлівай рэплікі пра генералаў ад прамысловасці і саўмінаўскія дзверы? Ад старшыні У.Куранкова, несумненна, варта чакаць больш грунтоўнага тлумачэння, чаму генеральны дырэктар "Гарызонта" А.Санчукоўскі не мае кантракту з Дзяржкампрамам? Чаму буйны крэдыт з ФРГ выкарыстаны без уліку перспектыўных патрэб? Чаму дзяржаве нанесена страта ў 12,85 мільёна рублёў?

Канешне, гэта справа самой Кантрольнай палаты, каго запрашаць да сябе для тлумачэнняў і спагнанняў. Але колькі нервовага пораху было спалена членамі савета, каб растлумачыць М.Ванкевічу відавочныя, элементарныя рэчы. Такі ўзровень дыялога характэрны для семінара на першым курсе інстытута, а тут многія ўжо акадэміі пазаканчвалі.

Напрыклад, М.Ванкевіч пачаў з таго, што не бачыць аніякіх парушэнняў законаў з боку Дзяржкампрама. Быццам бы Закон аб дзяржаўным бюджэце і не закон. Потым Міхаіл Яўгенавіч старанна тлумачыў прысутным, што існуе такое паняцце, як мэтазгоднасць, а перад ёю павінен скінуць капялюш нават Закон. Выходзіць, што ў сценах Дзяржкампрама жыве і квітнее асноўны бальшавіцкі пастулат аб усемагутнасці мэтазгоднасці?

Пакідаў трыбуну Міхаіл Яўгенавіч без ваяўнічасці. Сеў, выслухаў выступленні членаў савета Кантрольнай палаты. Абарона сустрэчнай атакай удачы не прынесла.

У зале быў створаны настрой, што нехта з адказных асоб павінен панесці пакаранне. Прапанову аб спагнанні трох акладаў з М.Ванкевіча падтрымалі Вячаслаў Радомскі і Васіль Далгалёў.

Але старшынствуючы на пасяджэнні Мікалай Корбут кінуў Ванкевічу выратавальны круг: "Ці зразумелі вы свае памылкі?".

Нялёгка было казаць Ванкевічу пакаянныя словы, ды пагроза страціць тры аклады прымусіла іх сказаць.

Член савета Васіль Рудзянок выказаў сумненне ў мэтазгоднасці пакарання трыма акладамі Ванкевіча на той падставе, што ў Дзяржкампраме ёсць больш буйныя фігуры.

Карацей кажучы, тры аклады намесніка старшыні засталіся пры ім. Персанальнага пакарання ў Кантрольнай палаце з кіраўнікоў Дзяржкампрама ніхто не атрымаў. Патрабаванні прыцягнуць да адказнасці службовых асоб пераўтворацца, як звычайна, у пошук стрэлачнікаў, псаванне нерваў трэццеразрадным асобам альбо зусім закончацца пустым гукам.

У той жа Дзяржкампрам накіроўваліся факты аб сур'ёзных парушэннях на рагачоўскім заводзе "Дыяпраектар". Выехала камісія, праверыла іх і супакоіла грамадства, маўляў, нічога сур'ёзнага мы не знайшлі. Ці не захацелі знайсці.

Не ведаю, што адчуваў у душы М.Ванкевіч пасля пасяджэння. Ён выйшаў з залы, закурыў, павольна спусціўся па лесвіцы да параднага пад'езда. Сеў і паехаў... З аднаго боку, ён перамог — не пакараны. З другога — яго атака адбіта. Нічыя.

Открытое письмо журналистке Елене Барановой из "Знамени юности"

Не пишите "экспроматом", коллега

Уважаемая Елена Баранова!

Когда я вернулся из отпуска, мне показали вашу заметку "Смесь французского с нижегородским?..", опубликованную в "Знамени юности" по поводу открытого письма собственных корреспондентов ряда зарубежных изданий, телевидения и радио белорусскому премьеру ("Народная газета", 3 сентября). Вы пишете,что "в команде "нижеподписавшихся" не оказалось собственных корреспондентов "Известий", "Комсомолки", "Труда", других традиционно маститых, ныне также зарубежных изданий", трактуя это случайное — применительно, по крайней мере, ко мне — обстоятельство явно не в пользу публично осуждаемых вами авторов упомянутого письма. Подобный прием выходит за рамки элементарной морали, и не только профессиональной. Нехорошо, когда чужое имя или чужая позиция используются для доказательства собственной правоты. Тем более что эта позиция вам неизвестна.

Скажу сразу: она в корне отличается от вашей. И не только по отношению к деятельности совминовской службы информации. Но и по отношению к тому, как вы понимаете работу журналистов вообще и собственных корреспондентов в частности. Особенно в той ее сфере, которая напрямую касается взаимоотношений с органами государственной власти.

По-вашему получается, что в этих взаимоотношениях никаких проблем нет. Достаточно, пишете вы, "позвонить в пресс-службу, прихватить редакционное удостоверение — и нет проблем". Но проблемы есть. Они, разумеется, не в невозможности совершать некие механические действия. И даже не в том, кто кому дозвонится первым — журналист до пресс-службы или наоборот. Эти проблемы — в нежелании органов государственной власти, в данном случае исполнительной, установить четкую правовую регламентацию упомянутых взаимоотношений. Подчеркиваю — правовую. А не своекорыстную, в интересах лишь одной стороны.

Об этом, собственно, и пишут собкоры зарубежных средств массовой информации в письме Вячеславу Кебичу, напоминая о своем естественном праве на беспрепятственный доступ к правительственной информации, об обязанности пресс-службы создавать для этого все необходимые условия. Аккредитация — в их числе. И не только в МИДе, о чем напоминаете вы "в качестве ликбеза". Собкоры, например, нашей газеты в дальнем, как принято говорить, зарубежье аккредитованы и в парламентах, и в правительствах тех стран, где они работают.

Вопрос об аккредитации не так прост и примитивен, как — походя — кажется вам. Более того, он представляется вам сугубо номенклатурным, каким и был в недавние времена. Собкоры "маститых" изданий "аккредитовались" при отделе пропаганды ЦК, вся деятельность которого применительно к ним сводилась к навязыванию выгодной для партийных органов "положительной" информации, ее дозированию, прямому вмешательству в работу собкоров, попыткам руководить ими и т.п. При вашем желании я мог бы многое рассказать, как все это делалось. Но, судя по тону и содержанию вашего сочинения, вы и так это знаете. С той, однако, разницей, что вам это нравится, а мне — нет. Ведь это вы делите зарубежные издания на "маститые" и "калибром помельче". Точно так же поступал приснопамятный отдел пропаганды, расписывая собкоров по номенклатурному рангу. А сегодня — совминовская пресс-служба, поменяв лишь критерии "дележки", поставив ее в зависимость от масштабов критики правительства и политической направленности публикаций. Отсутствие аккредитации позволяет пресс-службе быть свободной от своих прямых обязанностей. А журналистов, собкоров в частности, лишает возможности предъявить к этой службе законные — в буквальном смысле — требования, ставя их в унизительное положение "просителей", целиком зависящих от прихотей правительственных чиновников.

Речь, как вы понимаете, идет о свободе печати и возможностях ее подлинной независимости. По большому счету, о таком устройстве государственной жизни, которое наиболее полно удовлетворяет общественную потребность в правде. Но вас, судя по всему, беспокоит другое — личности "подписантов", их "калибр", то, что они "не из Парижа прибыли, не из Нью-Йорка и не из Москвы — все они работают (либо до некоторых пор работали) в "тутэйщых" белорусских газетах..." Оставим на вашей совести уничижительность тона, с каким вы употребляете белорусское слово. Тут важнее другое. Не имея аргументов в защиту своей позиции, равно как и самой позиции, вы подменяете их развязной хлесткостью, оскорбительной не только для ваших коллег, но и для журналистики в целом, если понимать под ней работу во благо общества. И для читателя, которому вольно или невольно вы внушаете мысль о журналистике как о профессии, призванной обслуживать частные интересы.

Уважаемая Елена Баранова! В своем сочинении вы допустили опечатку: вместо слова "экспромт" — "экспромат". Замечательный неологизм! Он абсолютно точно характеризует ваш стиль, в котором легковесный экспромт соединился с попыткой — в духе минувших лет — вывалить на читателя "компромат" на своих собратьев по профессии.

Не пишите "экспроматом", коллега!

С надеждой на понимание

Сергей ВАГАНОВ,
собственный корреспондент газеты "Труд" в Республике Беларусь.

У тэатрах сталіцы

Купалаўскі "нацыяналізуецца"

Юбілеем нестарэючай "Паўлінкі" пачаў свой 74-ы сезон Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы. Прэм'еру гэтага спектакля, які палюбіўся многім пакаленням, купалаўцы паказалі паўстагоддзя назад — у Томску.

Нагадаем, што паставіў вядомую камедыю заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі і Татарстана Леў Літвінаў. Унеслі свой важкі ўклад у поспех пастаноўкі таксама мастак Барыс Малкін і кампазітар Яўген Цікоцкі. У ролі Паўлінкі ў юбілейны вечар гледачы ўбачылі Зою Белахвосцік, якая ўвасабляе на сцэне гэты вобраз ужо больш за дзесяць сезонаў.

Аднак жыць толькі былымі заслугамі купалаўцам не ўласціва. Іх творчыя планы, якімі падзяліўся на зборы трупы мастацкі кіраўнік тэатра Валерый Раеўскі, поўныя новых ідэй. Ужо ў пачатку кастрычніка тут мяркуецца прэм'ера спектакля па камедыі Іагана Вольфганга Гётэ "Саўдзельнікі" — рэжысёрская работа акцёраў Ніны Піскаровай і Віктара Тарасава. На падыходзе — "Ідылія" Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў пастаноўцы Мікалая Пінігіна. У больш аддаленай перспектыве — "Лес" Аляксандра Астроўскага, а таксама п'есы Уладзіміра Караткевіча і іншыя. Поўны рашучасці спыніць сваю "пастановачную паўзу" і сам Валерый Раеўскі, які будзе працаваць над такімі складанымі творамі, як "Фауст" Гётэ і "Генрых IV" Шэкспіра. У мастацкага кіраўніка, дарэчы, сёлета таксама юбілей — дваццаць гадоў у купалаўскім.

Адразу некалькі прэм'ер чакаецца ў бліжэйшы час і на малой сцэне. У іх ліку — "Крэслы" Эжэна Іанеска. Вельмі разлічвае тэатр і на паяўленне ў сваім "партфелі" новых п'ес, асабліва беларускіх. Прычым тут гатовы супрацоўнічаць з аўтарамі напрамую і, паводле слоў Валерыя Раеўскага, добра аплачваць дастойную драматургію.

Чараду купалаўскіх свят дапоўніць яшчэ адна прыемная навіна. Як паведаміў міністр культуры Яўген Вайтовіч, цяпер рыхтуюцца ўсе неабходныя "паперы" для прысваення тэатру звання "нацыянальны". Гэта будзе першы і пакуль адзіны ў рэспубліцы тэатр з такім ганаровым статусам, які да многага абавязвае.

Віктар КУКЛОЎ,
Белінфарм.

Народная газета

Дом, который построил...

Супермаркет — западный, покупатели — мы

Несколько лет назад москвичи и гости столицы валом валили в "Макдональдс", где, простояв несколько часов в очереди, можно было вкусить от сервиса американской забегаловки и отведать настоящую котлету. Минчане сегодня едут в "Торговый дом на Немиге".

Тут все солидно, как в музее, блестит, как в операционной, обслуживание на высшем уровне, и, если бы не родные советские товары, можно считать, что "Торговый дом на Немиге" — первый в Минске супермаркет западного типа.

Солидность вполне объяснима: в учредителях "Торгового дома...", а точнее, совместного белорусско-германского предприятия "Роден—Минск" — управление госимущества и приватизации горисполкома г.Минска, ассоциация делового сотрудничества "Белфортекс", а с немецкой стороны — фирма "Хартман Гмбх", но не совсем ясны причины такого интереса к нам, средним покупателям с небольшим количеством "зайчиков" в кармане. Понятно же, что не скоро окупятся труд немецких дизайнеров, вложения фирм в "долгострой", который продолжался восемь лет. Однако не стоит думать, что владельцы "Торгового дома на Немиге" — это какие-то филантропы, которые в качестве гуманитарной помощи решили показать белорусам, как выглядит хороший немецкий магазин. Руководители "Роден—Минск" смотрят вперед и видят, что недалеко то время, когда в белорусской столице без умелой рекламы и качественного обслуживания продать даже самый лучший товар будет сложно, что количество людей, которые готовы выложить хорошие деньги за хорошую вещь и западный сервис, на улице Немига неуклонно увеличивается. Система снабжения в этом крупнейшем торговом предприятии задумана так, что она в любой момент выплеснет на шикарные прилавки любое количество отличного и дорогого товара — был бы спрос, были бы мы с вами, дорогие сограждане, богаче.

Когда открылся "Макдональдс", журналисты всего бывшего СССР предприняли несколько расследований, чтобы узнать, почему там не воруют на кухне. Сегодня минские журналисты выпытывают у администрации "Торгового дома на Немиге", почему там работают такие красивые девушки, всегда вежливые и готовые предложить тебе хоть десять вещей, прежде чем что-то выберешь. Администрация вежливо объясняет, что из огромного количества желающих поступить на работу выбрать красивых ничего не стоило, что все девушки работают по контракту. И он-то и вынуждает продавщиц работать хорошо.

Судя по всему, контракт разработан не без участия немецкой стороны, ибо требует от всех работников немецкой точности, вежливости и аккуратности. В противном случае работник наказывается материально, здесь очень гибкая система материальных наказаний и поощрений. Для того чтобы продавца наказали или поощрили, достаточно одного слова менеджера, который целый день за продавцом наблюдает. Ежедневно дается оценка работы каждого продавца и специалиста. Можно, конечно, возмущаться, что это очень напоминает тридцать седьмой год в миниатюре, ну а покупателям-то какое дело, ведь результат устраивает всех. Кстати, сами девочки знали, на что идут, и сознательно предпочли этот вариант стоянию с безразличным взглядом в углу секции.

И, хотя все труднее поддерживать реноме супермаркета для людей с любым достатком, "Роден—Минск" собирается расширить сферу влияния своего магазина. Вскоре тут откроются кафе-бар, секция продовольственных товаров, станет больше валютная секция. Чтобы покупатели уютно чувствовали себя, начнется салонная торговля.

Татьяна КАЛИНОВСКАЯ.
Фото Юрия БОНДАРЕВА.



Дзічэм?

Чэрап у каўшы экскаватара

Праз вёску Яловіца Смалявіцкага раёна дарожнікі "цягнуць" дарогу. І возяць для яе гравій з... чалавечымі касцямі.

Вось пра такі дзіўны факт паведаміла ў рэдакцыю Марыя Галінская з Жодзіна: "У мінулыя выхадныя ездзіла на дачу непадалёк ад вёскі Яловіца, і сама бачыла косці, што тырчалі са свежаасыпанай дарогі. Па прафесіі я ўрач-рэнтгенолаг і памыліцца не магла. Гэта чалавечыя косці. Выразна распазнала прамянёвую, бядровую, [illegible] знаходзіліся і чарапы людзей. Што магілі — пакавалі. Але хіба дарожнікі не бачылі, з чым гэта зямля? Ці ж можна быць такімі бесчалавечнымі?"

Начальнік УКСа Смалявіцкага райвыканкама Міхаіл Пяцека прызнаўся, што і яму быў гэткі ж званок, і... параіў звярнуцца да свайго падначаленага — начальніка ДРСУ Віталя Навуменкі. Маўляў, гэта яго людзі возяць гравій. Паводле слоў Віталя Навуменкі, кар'ер, дзе дарожнікі павінны былі браць гравій, знаходзіцца за 25 кіламетраў ад вёскі Яловіца, але майстар распарадзіўся прывезці дзве машыны з кар'ера каля вёскі Апуток, што на 9 кіламетраў бліжэй. [illegible]

Рэдакцыі абяцалі разабрацца, па чыёй віне адбыўся гэты абуральны выпадак, а таксама сабраць гравій з касцямі людзей і перазахаваць.

Спадзяёмся, што так яно і будзе. [illegible] Але ў сэрцы застаецца боль. Ёсць жа правіла маралі, нікім, праўда, няпісанае, але якое захоўвалася спрадвеку, — паважліва ставіцца да праху продкаў, ушаноўваць іх добрую памяць. Ёсць, нарэшце, у кожнага з нас душа і сумленне. Ці ўжо няма?

Юрый НАЯРОВІЧ.

Здымаем маску...

Узлёт і падзенне "Бізнес-трыумфу"

Віктар ЗАГРАДСКІ

Вялікі Камбінатар пераадолеў гэтую дыстанцыю ўсяго за адзін год. Перад ім паслужліва расчыняліся дзверы высокіх чыноў, ён свабодна атрымліваў шматмільённыя крэдыты. Абяцаў пабудаваць пад Мінскам іпадром і заапарк, а тым часам ганяў з-за мяжы шыкоўныя лімузіны... Цяпер Васіль Стасюк пад следствам.

Яму не проста шанцавала ў жыцці. Ён ведаў, чаго хоча і як дасягнуць мэты. Месцам рэалізацыі сваіх праектаў малады бізнесмен, які зусім нядаўна пераехаў у наш горад з Украіны, выбраў Мінск. [illegible]

Маючы адносна невялікі ўласны капітал, Васіль Стасюк вырашыў адкрыць сваю фірму. 24 сакавіка 1992 года ў Савецкім райвыканкаме г.Мінска была зарэгістравана пад N 1065 фірма "Бізнес-трыумф". Яе дзейнасць, амаль як ва ўсіх камерсантаў, шматпрофільная. Але асноўны ўхіл, безумоўна, гандлёва-закупачны. Дакладней кажучы, Стасюк меў намер усур'ёз заняцца аўтабізнесам.

Не доўга ён "варыўся" ва ўласным соку. Не хапала грошай, а з крэдытамі было тугавата. Неяк пабываўшы ў Заходняй Германіі, Стасюк пазнаёміўся з гаспадаром уласнай фірмы Норбертам Баўэрам. Яны хутка дамовіліся аб сумеснай справе. І ўжо праз пяць месяцаў пасля з'яўлення "Бізнес-трыумфа", у жніўні 1992 года, Стасюк і яго нямецкі кампаньён рэгіструюць у Мінскім гарвыканкаме СП "СНБ-аўта-трайдынг-К°". Статутны фонд — 1 мільён рублёў. Стасюк унёс палову гэтай сумы, Баўэр — 30 500 марак. Генеральным дырэктарам СП стаў Стасюк.

Да шырокага экспартна-імпартнага тавараабмену справа не дайшла. Да "камерцыйнага пасрэдніцтва з мэтай тэхнічнага пераўзбраення, рэканструкцыі вытворчасці", што адзначалася ў статутных дакументах, — таксама. Затое ў СП з'явілася большая магчымасць браць вялікія крэдыты. І займацца тым, аб чым увесь час марыў Стасюк.

Каб купіць машыны суперкласа па індывідуальных заказах, патрэбна была валюта. Маючы дзесяткі мільёнаў рублёў крэдыту, якія Стасюк і яго сябры атрымлівалі ў камерцыйных банках "Дукат" і "Поліск", [illegible]

Амаль за год фірма "Бізнес-трыумф" і СП закупілі і перагналі ў Беларусь 9 машын прэстыжных мадэляў. Былымі ў карыстанні аўта не займаліся. Ішло адно "новьё". Напрыклад, "Мерседэс" — за 237,1 тысячы марак, "Таёта" — за 50 тысяч долараў. Можна прыкінуць, колькі "кавалкаў" каштавалі ўсе купленыя машыны і што можна было за іх узяць тут.

Цяпер аб іншым і самым галоўным. Ёсць вялікая розніца паміж тым, якая машына перасякае граніцу — купленая якой-небудзь фірмай або прыватнай асобай. Возьмем той жа "Мерседэс-600" коштам 237 тысяч 146 нямецкіх марак. Фірма павінна заплаціць пошліну, што складае 10 працэнтаў ад кошту тавара, гэта значыць 23 тысячы 714 марак, або па курсу 12 мільёнаў 725,5 тысячы рублёў. Стасюк жа пераганяў машыны як... купленыя для ўласнага карыстання. І плаціў сімвалічную пошліну — 4 рублі за 1 "кубік" рухавіка — г.зн. каля 24 тысяч рублёў. Розніца ў сумах проста астранамічная!

Ёсць такое паняцце — "растаможванне". Інакш кажучы, афармленне неабходных дакументаў на таможні. Што рабіў Стасюк? За адзін дзень ён "растаможваў" машыну як прыватная асоба, ставіў не на ўлік як сваю ў ДАІ, у той жа дзень здымаў гэтую машыну з уліку і перадаваў праз сваё ж СП загадзя падрыхтаванаму пакупніку. І новы ўладальнік "іномаркі", маючы на руках рахунак-фактуру, мог фактычна зноў паставіць на ўлік машыну ўжо сваю. Выходзіць, адна і тая ж машына магла быць зарэгістравана двойчы (?).

Праз "Бізнес-трыумф" у Мінск трапіла 7 машын, праз СП "СНБ-аўта-трайдынг-К°" — 2. Толькі па першай фірме недаплата мытнага падатку склала каля 44 мільёнаў 16 тысяч 857 рублёў. [illegible] 236 тысяч рублёў.

[illegible] дэталь з біяграфіі Стасюка. [illegible] камерцыйнай дзейнасці яго ўжо прыцягвалі да адміністрацыйнай адказнасці (быў накладзены штраф) за няўплату падатку. Але і гэта не ўсё. За кантрабанду (правоз валюты) яму далі тры гады ўмоўна...

Да апошняга часу Стасюк быў на ўздыме. Марыў аб новых праектах, заводзіў выгадныя знаёмствы, хацеў нават заняцца дабрачыннай дзейнасцю. Пра яго сталі шмат гаварыць і пісаць. Асабліва калі фірма "Бізнес-трыумф" сумесна з замежнымі партнёрамі выказала намер удзельнічаць у будаўніцтве іпадрома і заапарка. Гарвыканкам гатовы быў выдзеліць для цуда-праекта неабходныя землі, Нацыянальны банк меў намер даць гарантыі для атрымання валютных інвестыцый і крэдытаў прыватнай фірме "Бізнес-трыумф"...

Вось такі клопат, такія гарантыі фірме, на рахунку якой грошай — кот наплакаў, не кажучы пра іншыя сродкі.

А рэпутацыя кіраўніка? Няўжо вялікі камбінатар Стасюк разлічваў і надалей "ганяць паветра" пад выглядам новых авантурных праектаў?

Тэатральны сезон

З мастацтвам сам-насам

Першы міжнародны фестываль монаспектакляў, які адкрыецца ў Мінску 22 кастрычніка, называецца коратка і выразна — "Я". Правесці яго вырашылі Саюз тэатральных дзеячаў Беларусі, Міністэрства культуры, Мінскі гарвыканкам, Камісія па справах ЮНЕСКА, нацыянальны цэнтр Міжнароднага інстытута тэатра, асацыяцыя тэатраў-студый Беларусі.

Тых, каму ёсць што сказаць не ў масоўцы, а сам-насам з залай, у Беларусі ўсё ж аказалася нечакана многа. Аргкамітэту на чале з заслужаным дзеячам мастацтваў рэспублікі Аляксеем Дударавым давялося адбіраць шэсць фестывальных спектакляў з семнаццаці прапанаваных. Таму сярод выканаўцаў ёсць пакрыўджаныя — той рэдкі выпадак, калі ў гэтым няма нічога дрэннага.

Адабраныя на фестываль работы самыя разнастайныя, аб'ядноўвае іх хіба талент рэжысёраў і неардынарнасць выканаўцаў — Таццяны Мархель ("Дзіця з Віфлеема"), Валерыя Шушкевіча ("Дабравесці ад Уладзіміра"), Галіны Дзягілевай ("Белы сон"), Уладзіміра Глазкова ("Запіскі вар'ята"), Генадзя Пшэніка ("Хачу быць чалавекам") і Сяргея Жураўля ("Патаемнае жыццё Сальвадора Далі").

Трапіць у глядзельныя залы будзе не вельмі цяжка і не дужа накладна — частка білетаў паступіць у свабодны продаж.

Ірына ДЗЯРГАЧ.

Почем валюта?

С 30 сентября Национальным банком установлены курсы иностранных валют

	Единый курс	Курс обязат. продажи	К долл. США
1 австрал.доллар	2,462.41	1,477.45	1.5432
1 австр.шиллинг	331.75	199.05	11.4544
1 фунт стерлинг.	5,732.30	3,439.38	0.6629
10 бельг.франков	1,091.94	655.16	34.8004
1 немец.марка	2,333.73	1,400.24	1.6283
1 голлан.гульден	2,079.34	1,247.60	1.8275
1 датская крона	576.52	345.91	6.5913
100 итал.лир	241.51	144.91	1,573.4338
1 канад.доллар	2,866.20	1,719.72	1.3258
1 норвеж.крона	534.50	320.70	7.1094
1 доллар США	3,800.00	2,280.00	1.0000
1 фин.марка	657.58	394.55	5.7788
1 франц.франк	671.09	402.65	5.6624
1 шведск.крона	474.92	284.95	8.0013
1 швейцар.франк	2,675.69	1,605.41	1.4202
10 японск.иен	360.00	216.00	105.5556
1 ЭКЮ	4,445.62	2,667.37	0.8548
10 испанск.песет	290.17	174.10	130.9577
10 греч.драхм	162.50	97.50	233.8462
10 турецк.лир	3.13	1.88	12,140.5751
1 эстонск.крона	291.72	175.03	13.0262
1 СДР	5,370.34	3,222.20	0.7076
1 российский рубль	1.50		
1 укр.карбованец	0.22		
1 литовский лит	894.12		
1 латвийский лат	6168.83		
1 кыргызстан.сом	584.62		

по экспортным контрактам, заключенным до 1 августа 1993 года.

Курс клиринговых валют

1 доллар США по расчетам с Кубой	2280.00
1 доллар США по расчетам с ЧСФР	2280.00

В соответствии с постановлением Национального банка и Совета Министров Республики Беларусь N 19/518 от 24 июля 1993 г. курс обязательной продажи субъектами хозяйствования 20% валютной выручки по контрактам, заключенным до 1 августа 1993 года, устанавливается на уровне 60% от единого курса Национального банка Республики Беларусь.

З прыёмнай "Народнай газеты" Тэл. 29-60-86

Бежанцы ўсё яшчэ па-за законам

Яшчэ адна нябачная свету драма. Сям'ю беларусаў Дваранінавых прагнала з Ташкента не вайна і не стыхія. Аб прычынах свайго выезду расказваюць скупа. Але, відаць, не ад добрага жыцця людзі за два дні распрадаюць нажытае гадамі, пакінуўшы непрададзеным толькі дом, і адпраўляюцца ў пошуках лепшай долі цераз граніцы і мытні.

Калі апынуліся на роднай зямлі, падумалі: самае горшае засталося ў мінулым.

... Юрысты ахвотна растлумачаць, што паняцце "бежанец" у айчынным заканадаўстве да гэтага часу адсутнічае. Значыць, ні правоў, ні абавязкаў для гэтай катэгорыі не існуе, абароны таксама шукаць няма дзе. У дзяржаўнай міграцыйнай службе рэспублікі разводзяць рукамі — няма прававой базы, тым больш няма сродкаў. Усё, што пакуль можам, — дык гэта зарэгістраваць і паставіць на ўлік да лепшых часоў. А ці вядома, што для ўладкавання адной сям'і бежанцаў патрабуецца на сённяшні дзень некалькі мільёнаў рублёў?

Але Дваранінавы не просяць тых мільёнаў. Ёсць хата ў Мінскім раёне, у свой час купленая пад дачу сваякамі. Дырэктар мясцовага саўгаса гатовы ўзяць на працу мужа і жонку. І каб пракарміць сям'ю, былы машыніст Ташкенцкага метрапалітэна, які раней хадзіў на работу ў белай кашулі, надзене гумавыя боты і пойдзе пасвіць жывёлу. Дзе ж дзенешся?..

Але трапіла ташкенцкая сям'я ў тое замкнутае кола, па якому да іх ганяла не адну сям'ю бежанцаў. На працу не бяруць без прапіскі, прапіску не даюць без квадратных метраў. У хаце, купленай пад дачу, прапісацца нельга. Да ўсяго яшчэ старшыня сельсавета бясконца патрабуе даведку аб грамадзянстве.

Сям'я траціць апошнія грошы, якія засталіся пасля пераезду. Людміла Дваранінава кожную раніцу ездзіць у Мінск, як на працу, гадзінамі праседжваючы ля начальніцкіх кабінетаў. Каля месяца яе ганяюць з кабінета ў кабінет. Калі яна прыйшла ў рэдакцыю "Народнай газеты", мы ўбачылі страшэнна стомленую, у адчаі жанчыну.

... Шмат ужо сказана і напісана аб недасканаласці нашага заканадаўства, дзе вельмі часта не ўлічваюцца новыя рэаліі. Адзінае, у чым закон пайшоў насустрач такім, як Дваранінавы, — дазволіў спрошчаную працэдуру атрымання грамадзянства. Хоць і гэта, як бачым, яшчэ не даведзена да ведама ўсіх старшынь сельсаветаў. Але па-ранейшаму бежанцы не могуць прапісацца, не маючы на душу 12 "квадратаў" (а каго з гэтых няшчасных тут чакаюць харомы?), па-ранейшаму, не аформіўшы грамадзянства, не змогуць атрымаць зямлю, узяць пазыку і г.д.

Магчыма, улады рэспублікі не жадаюць лішнімі льготамі стымуляваць міграцыю звонку, але зусім не заўважаць такіх вось людзей — амаральна. Чатыры мільёны беларусаў налічваюць у блізкім замежжы. Каля мільёна з іх, лічаць эксперты, у бліжэйшы час маюць намер вярнуцца на радзіму.

... Званкі з рэдакцыі падзейнічалі — Дваранінавым абяцалі дапамагчы з прапіскай. Калі дакладней, абяцалі знайсці спосаб абысці інструкцыю. Што сказаць пра дзяржаву, у якой добрую справу можна зрабіць, толькі парушыўшы закон?..

Ігар ФІЛІПЕНКА.

Будь хозяином
Ваш дом, сад, огород

Возьмите на заметку

Чтобы витамины "А" не пропадали...

Вырастили хороший урожай моркови, но не знаете, как ее сохранить?

Убранную, хорошо очищенную от земли морковь покройте глиной или гашеной известью (мелом). Для этого корнеплоды в ящиках или в корзинах погрузите в водную сметанообразную глиняную суспензию (7 процентов от массы корнеплодов) или известкового молока (1 кг на 10 л воды). Дав излишней воде стечь, ящики установите в хранилище: при усиленной вентиляции в течение 1—2 дней слой глины или извести подсохнет. Образовавшаяся пленка защитит коренные плоды от увядания и поражения гнилями, обеспечит хорошую сохранность моркови в течение зимы.

Температура воздуха в местах хранения корнеплодов должна быть в пределах 1—2 градусов тепла, влажность воздуха — 85—90 процентов.

Читатель — читателю

Помогите, люди добрые, с картофелем

Уважаемая редакция! Просим опубликовать наше письмо-просьбу: может, кто нас и выручит.

Дело в том, что нам очень нужен картофель для личных хозяйств. В связи с наводнением мы оказались в трудном положении. Если у кого есть картофель для продажи или кто нуждается в рабочей силе для уборки картофеля, мы согласны приехать помочь, чтобы нам выделили картофель или продали.

Наш адрес: 247857, Гомельская область, Лельчицкий район, деревня Дзержинск. Мария Андреевна МИШКЕВИЧ, Галина Николаевна ЦЫБУЛИЧ, Фаина Терентьевна БОБОВИЧ.

Наша реклама — ваши деньги

Нужны лучшие в СНГ сорта смородины? Пожалуйста!

Да, именно лучшие сорта смородины — и черной, и красной — мы предлагаем.

Реализация — по предварительным заявкам.

Тел. в Минске: 36-60-92, 97-82-06.

Опыт Василия Черкаса

Золотой корень

Тот, кто найдет золотой корень, будет удачлив в жизни, проживет два века... Этой пословицей жители Памира подчеркивали большую лечебную силу золотого корня. Молодожены, которым корень дарился в день свадьбы, были уверены в здоровом потомстве, а старики, употреблявшие его, становились молодыми, к ним возвращалась "мужская сила".

Про лечебную силу корня ходят легенды. Недаром еще 400 лет назад с большим риском для жизни тибетские ламы снаряжали экспедиции на далекий Памир и Тянь-Шань в поисках золотого корня. А местное население строго хранило тайну мест его произрастания и под большим секретом передавало ее из поколения в поколение. Исследователи золотого корня утверждают, что по отдельным лечебным направлениям он превосходит знаменитый женьшень, хотя в целом и уступает ему.

Одно из самых любимых моих растений. Я его не только люблю, но и уважаю. Уважаю за то, что это единственное растение, в выращивании саженцев которого я терпел поражения. Семена настолько малы, что даже в лупу не разглядишь хорошо. Углубишь в почву на 1—2 мм, а у него уже и нет сил прорасти. Хотя по живучести ему нет равных. Были случаи, когда корень, год провисев на чердаке, весной размачивался, после посадки в почву давал всходы и хорошо рос все лето.

В этом году по разработанной мной технологии на 2 кв. метрах я прорастил, вырастил и рассадил по грядам 5200 штук саженцев золотого корня.

Высушенные корневища цвета старой позолоты при изломе испускают слабый запах розы, за что и получено от ботаников название — родиола розовая.

Лечебное действие препаратов родиолы сходно с действием женьшеня, элеутерококка, лимонника, моральего корня.

Некоторые садоводы выращивают очиток живучий, очиток ползучий, ошибочно принимая их за родиолу розовую.

Деревня Любачин Лунинецкого района.

Личный опыт

Как я накипь победила

Только купишь чайник, а уже через месяц в него заглядываешь с тоской — накипь. Мучилась с ней долго и я. Пока не прочитала где-то дельный совет и сама попробовала. И накипь исчезла.

Что надо сделать?

В чайник наливают раствор стиральной соды (чайная ложка на стакан воды). Затем ставят его на огонь и кипятят раствор до тех пор, пока накипь не размягчится. После этого накипь удаляют щеткой или деревянной палочкой. Носик чайника следует прочистить ершиком.

Вместо соды можно применить уксус или уксусную эссенцию. На литр воды нужны 1—2 чайные ложки эссенции или 4—5 столовых ложек уксуса. Кипятят раствор полтора-два часа.

Есть еще одно народное средство уничтожения накипи. В чайник кладут промытые картофельные очистки и, налив воду, кипятят до размягчения накипи.

Нина ГЛОТОВА.

Спрашивали? Отвечаем

Печь в доме: и тепло, и глазу приятно...

"Сложили мне на даче печку. А как ее правильно оштукатурить — не знаю", — пишет нам И.Самусевич из г.Гомеля.

Специалисты советуют поступать так. Прежде всего удалите с поверхности печи всю глину и выберите ее из швов кладки (не менее чем на 10 мм глубиной). Если печь новая, хорошо просушите ее, протопите — раствор нужно класть на горячую поверхность. Наносите его в два-три слоя, общая толщина штукатурки — 10—15 мм, не более. На хорошо смоченную поверхность нанесите жидкий слой раствора — до 5 мм, затем — более густой. Этот грунт тщательно разровняйте и затрите. Трещины, образовавшиеся при высыхании штукатурки, разрежьте, смочите водой и замажьте раствором. И так несколько раз — до тех пор, пока трещин не останется.

Варианты состава раствора таковы (все части объемные): а) 1 часть гипса + 2 части известкового теста, 1 часть песка, 0,2 части асбеста N 6—7; б) 1 часть глины, 2 части песка, 0,1 части асбеста N 6—7; в) все составные те же, что и в варианте "б", только добавляется 1 часть цемента.

Технология приготовления раствора несложна. Глиняное тесто процедите через частое сито (с ячейками 5 x 5 мм). Песок просейте. Отмеренное количество глины, песка и асбеста перемешайте, добавьте цемент и снова перемешайте. Разведите водой, если нужно. Используйте в течение часа, не позднее.

Оштукатуренную поверхность печи можно окрасить известковой краской. Для этого известковое тесто или известь-кипелку разведите до нужной густоты свежим снятым молоком и процедите. Известь можно подсолить: на ведро добавить 100 г столовой соли, разведенной в воде, и перемешать. Такая окраска прочна и не пачкает.



Рисунок Олега ПОПОВА.

Век живи — век учись

Если в деревянном полу образовались щели,

... то заделать их можно с помощью реек.

Но можно обойтись и без них. Вместо реек употребляют специальную замазку. Она состоит из одной части (по весу) охры, одной части древесных опилок и одной части клея. Накануне приготовления замазки клей кладут в какой-либо сосуд и заливают водой. Таким образом он превращается в студенистую массу. На другой день размешивают охру с небольшим количеством воды, а затем тщательно перемешивают с клеевым студнем. При этом раствор слегка подогревают.

Когда смесь остынет, прибавляют понемногу опилки и воду, пока замазка не станет достаточно густой. Употреблять ее в дело можно лишь после того, как она остынет.

Если на потолке видны следы кисти...

... То вы неправильно красили потолок. Его следует красить, водя кистью продольно по отношению к источнику света. Потолок, покрашенный поперек, будет выглядеть некрасиво, так как на нем будут заметны следы кисти.

Кстати, желательно систематически производить побелку помещения. Это легко сделать при наличии пылесоса с пульверизатором. Тщательно размешанный и процеженный раствор краски наливают в банку и плотно закрывают крышкой. Для того чтобы побелка полностью выбиралась из банки, необходимо удлинить засасывающую трубочку небольшим куском резиновой или полихлорвиниловой трубки.

И быстро, и качественно.

Рубрику ведет Павел СТАСЕВИЧ Тел. 29-60-42.

Что за цифрой Госкомстата?

О процессе либерализации цен в потребительском секторе экономики Республики Беларусь

За период с декабря 1990 года по август 1993 года розничные цены на продовольственные товары в целом возросли в 201,7 раза, а на продукты питания (без учета изменения цен на алкогольные напитки) — в 282 раза.

Первым шагом на пути либерализации цен в потребительском секторе экономики стало увеличение со 2 апреля 1991 года розничных цен на хлеб и хлебобулочные изделия, мясопродукты — в 3 раза, рыбопродукты, молоко и молочные продукты — в 2,3 раза, сахар — в 2,35, растительное масло, маргарин — в 2, соль — в 3,4, пищевые концентраты — в 3 раза. В результате, в апреле по сравнению с декабрем 1990 года цены на продукты питания возросли в 2,1 раза. Это повышение цен вызвало социальную напряженность в обществе и до окончания 1991 года процесс либерализации цен был приостановлен.

В начале 1992 года правительство республики, реализуя программу перехода к рыночной экономике, отказалось от широкомасштабного государственного регулирования цен, предоставив полномочия по определению и установлению цен непосредственно производителям. Под контролем государства остались только цены на товары и услуги, имеющие особую социальную значимость, обеспечивающие определенную устойчивость потребительского рынка, а также цены на энергоносители. При этом предельные цены на хлебобулочные изделия и молочные продукты были увеличены в 3 раза, масло животное — в 5 раз, сахар и ликеро-водочные изделия — в 4 раза.

За январь 1992 года цены на продовольственные товары в целом возросли в 2,8 раза и превысили уровень декабря 1990 года в 4,5 раза.

В феврале 1992 года по сравнению с январем в 7,1 раза увеличились цены на мясо и птицу, в 2,9 раза — на колбасные изделия. В дальнейшем, до конца 1992 года, среднемесячный рост цен на продовольственные товары составлял около 16 процентов.

В январе—августе 1993 года цены на продовольственные товары возрастали ежемесячно в среднем на 26 процентов. В результате в августе по сравнению с декабрем 1992 года цены на продовольственные товары возросли в 6,3 раза, на продукты питания — в 7 раз.

Рост цен по отдельным группам продовольственных товаров характеризуется следующими данными:

/коэффициенты (количество раз)/

	Цены в августе 1993 года		
	к ценам декабря 1992 г.	к ценам декабря 1991 г.	к ценам декабря 1990 г.
Мясо и птица	9,0	196,8	504,7
Колбасные изделия	8,8	121,9	293,1
Консервы мясные	8,1	118,7	457,1
Рыба	11,4	264,5	614,9
Сельдь	12,7	339,2	1117,8
Консервы рыбные	8,0	381,4	594,9
Масло животное	6,6	170,3	423,5
Масло растительное	4,2	94,5	197,2
Маргарин	3,8	131,0	254,9
Молоко и молочная продукция	9,7	102,2	224,7
Сыр	10,0	128,2	272,0
Яйца	2,6	81,3	183,7
Сахар	8,6	305,5	876,5
Кондитерские изделия	5,0	129,8	331,4
Чай	10,3	158,9	402,7
Мука	5,2	202,2	623,5
Хлеб и хлебобулочные изделия	5,3	110,6	312,2
Крупа и бобовые	6,5	114,4	355,3
Макаронные изделия	5,7	196,3	610,8
Алкогольные напитки	3,7	75,4	85,2

Понижающим сводный индекс цен на продовольственные товары фактором является динамика цен на плодоовощную продукцию. Так, в августе 1993 года по сравнению с декабрем 1990 года цены на овощи увеличились в 72 раза, на плоды — в 62 раза.

Цены на непродовольственные товары по отношению к декабрю 1990 года в декабре 1991 года возросли в 2,2 раза, в декабре 1992 года — в 34,3 раза, в августе 1993 года — в 222,5 раза. Ниже приводятся данные о динамике цен на непродовольственные товары в разрезе товарных групп:

/коэффициенты (количество раз)/

	Цены в августе 1993 года		
	к ценам декабря 1992 г.	к ценам декабря 1991 г.	к ценам декабря 1990 г.
Ткани	4,9	75,9	189,0
Одежда и белье	5,2	50,4	140,6
Трикотажные изделия	6,6	63,6	154,5
Кожаная обувь	6,6	93,7	248,7
Чулочно-носочные изделия	4,0	55,4	102,8
Металлическая посуда	10,5	119,2	431,8
Фарфоро-фаянсовая и стеклянная посуда	5,2	88,7	196,0
Бумага и канцтовары	19,6	401,2	715,7
Мебель	5,7	114,6	331,7
Электротовары	5,9	112,7	321,6
Радиотовары	7,3	138,4	261,4
Спорттовары	9,6	115,8	280,4
Велосипеды и мотоциклы	8,2	162,2	397,9
Строительные материалы	8,3	168,7	749,3
Ювелирные изделия	11,4	92,2	112,1
Легковые автомобили	9,8	266,1	521,9
Мыло хозяйственное	6,6	190,1	422,1
Табачные изделия	3,5	183,8	326,2
Медикаменты и химтовары	15,6	124,3	135,2

Ситуация на рынке потребительских услуг республики характеризуется резким сокращением спроса на них. По известной закономерности, в условиях роста стоимости жизни, потребитель стремится к уменьшению расходов и в первую очередь сокращает расходы на культуру и досуг, затем экономит на бытовых услугах и покупке промышленных товаров. Как показывает анализ структурных изменений спроса населения на платные услуги, удельный вес услуг культуры снизился в текущем году по сравнению с 1991 годом на 40 процентов, бытовых услуг — на 30 процентов. В то же время удельный вес услуг пассажирского транспорта в общем объеме платных услуг населению возрос почти на 70 процентов, а коммунальных услуг — на 24 процента. При этом общий объем платных услуг в сопоставимых ценах в 1992 году по сравнению с 1991 годом сократился на 26 процентов, за январь— август 1993 года по сравнению с соответствующим периодом прошлого года — на 27 процентов.

Существенное влияние на снижение спроса населения на услуги, наряду с ростом цен на продовольственные и непродовольственные товары, оказывает и рост их стоимости. В декабре 1991 года цены на платные услуги населению превышали уровень декабря 1990 года в 1,9 раза, в декабре 1992 года — в 39,6 раза, в августе 1993 года — в 233 раза.

Изменение цен на бытовые услуги происходило скачкообразно. Первый такой скачок произошел в феврале 1991 года, когда за один месяц цены возросли на 30 процентов. Следующее значительное увеличение цен произошло в январе—феврале 1992 года. Тогда, всего за два месяца, цены на бытовые услуги увеличились в 3,3 раза. Затем цены резко повышались в апреле, мае, октябре и ноябре. В декабре 1992 года уровень цен на бытовые услуги превысил уровень декабря 1990 года в 52 раза, в августе 1993 года — в 306 раз.

Средние цены на бытовые услуги (по данным обследования предприятий государственной формы собственности)

в рублях

Виды бытовых услуг	Средняя цена: в декабре 1991 г.	в декабре 1992 г.	в августе 1993 г.
Пошив сапог женских на высоком каблуке	246	4585	16282
Ремонт обуви (набойки)	3	60	390
Пошив пиджака мужского (без стоимости материалов)	128	1610	8357
Пошив платья женского (без стоимости материалов)	81	958	4128
Ремонт цветного телевизора (с заменой кинескопа)	324	7090	47736
